Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЕТЭАРАЛАГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ

ГАЛОЎНАГА КІРАЎНІЦТВА І ГІДРАМЕТ-ІНСТЫТУТА

Адрас рэдакцыі: Менск, р. Карла Маркса і Чырвонаармейскай, 48, Галоўнае Кіраўніцтва АГМС БССР.

№ 8 (141)	11—20 сакавіка	1934 г.

ЗМЕСТ

Сінаптычны агляд з 11 па 20 сакавіка

У гэту дэкаду ажыццявіўся пералом на вясну—для паўднёвых раёнаў БССР 13 сакавіка і для астатняй часткі БССР 14 сакавіка. Снегатаянне праходзіла дружна без затрымак. Тэмпература пасля пералома трымалася ўвесь час вышэй нуля градусаў, падымаючыся ў некаторыя дні на поўдні да +12, +16 градусаў і на поўначы +6, +9 градусаў.

Прахладнае надвор'е першых дзён дэкады абумоўлівалася наступным. Цыклон, які прайшоў па еўрапейскай тэрыторыі Саюза, у канцы папярэдняй дэкады, выклікаў за сабою абвал праз Скандынавію халодных мас морскага арктычнага паветра, якое ў далейшым змясцілася на ўсход і паўднёвы ўсход, уступіўшы месца энергічна наступаўшаму з паўднёвага захада цёпламу морскаму і субтрапічнаму паветру.

Табліца вынікаў метэаралагічных

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпература паветра															
			11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нармальн.	Максімальная	Мінімальная	Чысло, калі нагляд. мінімум
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	—7	—9	—6	3	2	2	1	2	2	2	—	—1	—	6	—14	12
	3	Полацак	—4	—9	—6	2	3	3	2	2	2	2	—	0	—2	7	—15	12
	—	Вялікія-Лукі	—6	—8	—8	2	1	3	1	2	2	4	—	—1	—	5	—13	13
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	—5	—9	—6	2	1	2	1	1	1	2	—	—1	—3	5	—12	13
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	—4	—6	—4	2	3	4	1	2	3	3	—	0	—	8	—10	13
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў	—3	—4	—2	2	3	3	2	3	4	4	—	1	—2	7	—7	12
	16	Менск	—4	—4	—2	2	2	3	2	3	5	5	—	1	—2	9	—7	12
	23	Мар'іна-Горка	—4	—3	—2	2	3	4	2	3	4	4	--	1	—1	8	—7	11
	25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	10	Орша	—3	—5	—4	2	2	3	1	2	2	2	—	0	—2	7	—13	13(?)
	19	Горкі	—5	—8	—5	2	1	2	1	2	2	2	—	—1	—3	6	—12	13
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	—3	—2	0	3	3	4	2	4	7	5	—	3	—	11	—6	11
	30	Мар.-Сосны	—1	—1	1	6	4	6	2	6	8	4	—	4	—1	14	—2	11
	21	Магілеў	—3	—5	—4	3	3	3	1	2	3	4	—	1	—2	8	—9	13
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	—2	—4	—4	4	3	2	4	2	4	3	—	1	—2	9	—8	13
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	32	Жлобін	—1	—2	—1	5	2	3	3	4	5	7	—	2	—1	12	—4	12
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	0	0	3	8	4	7	3	7	8	4	—	4	0	15	—3	13
	37	Калінкавічы	0	0	2	9	5	5	3	7	8	8	—	5	—1	16	—1	12
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	—1	—1	0	7	3	3	6	4	5	7	—	3	—2	12	—3	1[illegible]
	35	Васілевічы	0	0	0	8	4	4	3	6	6	8	—	4	—1	15	—1	1[illegible]
	40	Людвінава	0	1	2	6	5	1	7	6	7	8	—	5	0	13	—2	11

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %%	Тэмпература паверхні глебы			Ападкі ў мм												Метэаралагічная з'ява (у дужках адзначаны числы)
	Максімал.	Мінімальн.	Чысло, калі нагляд. мінімум	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сума	
82	—	—	—	..	..	4.0	..	3.0	..	1.0	1.0	0.4	0.2	—	9.6	туман (15), галалёд (13)
87	—	—	—	0.2	..	1.0	1.0	3.0	2.0	5.0	1.0	..	1.0	—	13.3	галалёд (13), туман (15)
83	3	—16	20	..	..	3.0	0.1	1.0	0.3	0.6	2.0	..	..	—	7.0	туман (15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	6	—14	13	..	..	2.0	1.0	0.3	..	14.0	..	..	2.0	—	19.3	мяцель (13), туман (11)
85	—	—	—	0.1	..	1.0	8.0	0.6	5.0	5.0	2.0	0.1	0.5	—	22.3	туман (13), галалёд (19)
—	—	—	—	..	1.0	3.0	6.0	..	6.0	4.0	0.4	1.0	..	—	21.4	туман (14, 19)
—	—	—	—	0.1	..	2.0	5.0	0.1	2.0	3.0	2.0	0.1	0.3	—	14.6	туман (14, 19, 20)
90	—	—	—	..	1.0	1.0	7.0	0.6	2.0	6.0	2.0	..	..	—	19.6	галалёд (13), туман (13)
89	8	—8	12	2.0	3.0	3.0	5.0	0.3	7.0	4.0	0.1	0.1	0.1	—	24.6	мяцель (11), туман (13)
90	12	—6	11	1.0	0.5	3.0	4.0	1.0	0.4	2.0	0.1	..	0.1	—	12.1	туман (13), галалёд (15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
91	—	—12	13	0.1	0.1	2.0	5.0	..	..	6.0	..	0.1	1.0	—	14.3	туман (18, 14)
91	—5	—10	12	0.1	0.1	3.0	6.0	0.1	0.2	1.0	0.1	0.1	0.6	—	11.3	мяцель (12, 13)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
88	4	—6	11	3.0	2.0	1.0	2.0	2.0	1.0	1.0	3.0	..	..	—	15.0	туман (13), граза (18)
77	—	—3	11	1.0	0.1	3.0	2.0	1.0	0.1	..	0.1	..	0.1	—	7.4	туман (12, 13)
96	—	—	—	6.0	..	2.0	4.0	3.0	0.1	..	3.0	..	..	—	18.1	туман (11), мяцель (12)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
84	—	—	—	..	2.0	3.0	1.0	1.2	..	3.0	..	..	0.6	—	10.8	туман (11, 13, 16, 17, 19)
—	—	—	—	3.0	4.0	1.0	3.0	0.3	0.5	0.1	0.3	0.6	3.0	—	15.8	туман (17, 20)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
86	—	—	—	2.0	0.4	3.0	0.1	1.0	0.2	1.0	0.1	0.1	0.3	—	8.2	туман (3, 14)
76	—	—5	13	2.0	1.0	1.0	0.1	..	..	2.0	0.1	..	..	—	6.2	туман (15, 17)
88	—	—	—	3.0	0.4	1.0	..	..	..	2.0	..	..	..	—	6.4	туман (15, 17)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	1.0	1.0	1.0	0.6	0.1	0.1	5.0	..	0.1	0.1	—	8.9	туман (13, 16)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
81	—	—	—	2.0	1.0	2.0	0.6	..	0.1	5.0	..	0.1	..	—	10.8	мяцель (12), туман (13)
74	—	—1	12	2.0	2.0	1.0	0.2	..	0.1	4.0	0.1	..	0.2	—	9.6	—
76	18	—3	11	4.0	6.0	2.0	0.2	0.1	0.1	8.0	0.2	0.1	0.1	—	20.8	туман (12, 18)

Табліца вынікаў метэаралаг. назіранняў за 11—20 сакавіка 1934 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы: Напрамак	Вецер: Пераважаючы: Хуткасць	Вецер: З максім. хуткасцю: Напрамак	Вецер: З максім. хуткасцю: Хуткасць	Інсаляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Агульная	Сярэдняя воблачнасць у 10-балавай сістэме: Ніжняя	Сярэдні стан паверхавага пласта глебы (на глыб. 10—15 см)
I. Паўночны (вазёрны)	2	Дрыса	SE	4	SE	7	—	9	8	мокрая
	3	Полацак	E	4	E	—	—	9	8	замерзшая
	—	Вялікія Лукі	E	4	E	10	—	9	8	вільготная
	63	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	68	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва	SE	4	SE	10	5	9	9	замерзшая
II. Пераходны (вадападзельны)	8	Лепель	E	4	E	7	—	9	8	мокрая
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	„
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	„
	13	Барысаў	SE	2	SE	7	—	10	10	„
	16	Менск	S	2	E	4	—	9	9	„
	23	Мар'іна-Горка	E	4	E	7	—	10	9	„
	25	Асіпавічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	10	Орша	SE	2	NE	4	—	9	8	замерзшая
	19	Горкі	SE	4	SE	10	—	10	8	мокрая
III. Цэнтральны (раўніны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак	SE	2	SE	10	—	8	8	—
	30	Мар'іна-Сосны	E	2	W	7	—	8	8	мокрая
	21	Магілеў	SE	2	SE	7	—	9	8	„
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	E	4	SW	10	—	9	9	не замерзшая
	191	Касцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	31	Турск	—	—	—	—	—	—	—	—
	32	Жлобін	E	2	E	7	—	10	8	мокрая
IV. Паўднёвы (нізіны)	33	Жыткавічы	SE	4	SE	4	—	9	8	вільготная
	37	Калінкавічы	SE	4	SE	7	—	10	8	„
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	—
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	83	Барба	—	—	—	—	—	—	—	—
	38	Гомель	E	4	SE	7	—	8	8	мокрая
	35	Васілевічы	SE	4	SW	7	17	8	6	„
	40	Людвінава	E	4	S	4	—	10	9	„

Барычна малюнак разгортваўся наступным чынам: цыкланічная дзейнасць на палярным (субтрапічным) фронце адбывалася ў пачатку дэкады ў Атлантычным акіяне і на паўднёвым захадзе Еўропы і паступова перамяшчалася на Цэнтральную Еўропу, а затым і на еўрапейскую тэрыторыю Саюза, уцягваючы на ўсход цёплыя масы субтрапічнага і морскага палярнага паветра.

Халоднае паветра, якое зайшло ў канцы апошняй дэкады на еўрапейскую тэрыторыю Саюза, утварыла грэбень высокага ціску, які стаў змяшчацца на ўсход і ў канцы дэкады зліўся ў сістэму Сібірскага максімума.

Агульны фон барычных сістэм у гэтую дэкаду складаўся так: на ўсходзе еўрапейскай тэрыторыі Саюза наглядалася перавага вобласцей высокага ціску, у Заходняй Еўропе і заходняй частцы еўрапейскай тэрыторыі Саюза перавага вобласцей нізкага ціску. Такое размяшчэнне стварала моцную паўднёвую цягу ў заходняй частцы Саюза з вялікімі дадатковымі тэмпературамі, якія і ажыццявілі ў гэтым годзе пералом на вясну.

І. Рачыцкі.

Метэаралагічная характарыстыка

за 11—20 сакавіка 1934 г.

Сярэдне-сутачная тэмпература паветра ў гэту дэкаду вельмі высокая. Яшчэ першыя тры дні па ўсёй БССР, апроч паўднёвай зоны, трымаюцца адмоўныя тэмпературы (на поўначы да —9°). 14-га па ўсёй БССР устанаўліваюцца дадатныя тэмпературы, якія хістаюцца ў паўночнай зоне ад 1° да 3°, у паўднёвай ад 3° да 9° і ў цэнтральнай частцы ад 1° да 7°. Наогул маем павышэнне тэмпературы з поўначы на поўдзень. Сярэдняя тэмпература за дэкаду па БССР хістаецца ад —1 да +5° і з'яўляецца на 2-3° вышэй нармальнай, у прыватнасці ў паўднёвай зоне, якая вышэй нармальнай нават на 4-5°.

Максімальная тэмпература хістаецца ад 5° на поўначы да 16° на поўдні БССР.

Мінімальная тэмпература хістаецца ад —1° на поўдні да —15° на поўначы, прычым гэтыя нізкія тэмпературы наглядаліся выключна ў першыя дні дэкады.

Ападкаў за гэтую дэкаду выпала даволі значная колькасць. Асабліва вялікія ападкі наглядаліся ў раёне Лепель—Барысаў—Менск, звыш 20 мм. У паўднёвай зоне выпала менш—6—10 мм, за выключэннем Людвінава (Камарынскі р-н), дзе выпала 20,8 мм. На працягу дэкады ападкі размеркаваліся наступным чынам: у паўночнай зоне пераважныя іх колькасці выпалі 13-га, 15-га, 17-га і ў пераходнай—13-га, 14-га, 16-га і 17-га, у цэнтральнай—з 11-га да 15-га і ў паўднёвай зоне—11-га, 12-га і 17-га. Апошнія тры дні ападкі наглядаліся рэдка і ў невялікіх колькасцях.

Снегавы насціл, магчыма сказаць, што ліквідаваўся. Лепель, Менск, Орша, Горкі. Чэрыкаў і Касцюковічы адзначаюць снегавы насціл толькі мясцамі і як выключэнне Новае-Каралёва (Лёзнянскі раён) адзначае вышыню снегу 26 см.

Вятры пераважалі паўднёва-ўсходнія з невялікай хуткасцю. Воблачнасць была значная, 90—100% агульнага пакрыцця неба. Павярховы пласт глебы амаль паўсюды ўжо адтаяў.

Н. Малішэўская.

Сельска-гаспадарчая гідраметрычная характарыстыка

Ужо з першых дзён другой пяцідзёнкі ў паўднёвых раёнах зямля пачала адтайваць.

У паўночна-ўсходніх раёнах, у звязку з больш мошчным снегавым насцілам, пры не такім хуткім павышэнні тэмпературы, таянне снегу працягвалася да канца дэкады.

Становішча азімых па даным ажыўлення, праведзенага 16/III, у паўночнай і пераходнай зонах здавальняючае.

Па паўднёвай зоне некаторыя станцыі, як Васілевічы, Лельчыцы, Бабічы, даюць вялікі процант загінуўшых раслін, што не заўсёды трэба адносіць толькі за лік шкоднага ўплыву метэаралагічных фактараў. Патрэбна адзначыць, што на станцыі Бабічы ўчастак, з якога браліся пробы на ажыўленне, з восені быў страўлен жывёлай, што магло дрэнна адбіцца на становішчы азімых у час перазімоўкі.

Гэтым станцыям дано заданне зрабіць нечарговае ажыўленне з мэтай выяўлення сапраўднага становішча азімых.

В. Стэфановіч.

Метэаралагічная станцыя і яе роля ў абслугоўванні с/гаспадаркі

Метэаралагічнай станцыяй завецца спецыяльная ўстанова, якая вядзе сістэматычныя назіранні над надвор'ем ў строга вызначаныя тэрміны па ўстаноўленай інструкцыі і карыстаючыся строга праверанымі прыладамі.

На звычайных метэаралагічных станцыях II разрада вядуцца наступныя назіранні: над ціскам атмасферы, тэмпературай паветра, тэмпературай глебы, вільготнасцю паветра, ветрам, воблачнасцю, сонечным ззяннем, ападкамі, вышынёй і шчыльнасцю снегавога насціла і наогул над усімі з'явамі, якія адбываюцца ў паветры. Для сельскай гаспадаркі не ўсе элементы надвор'я, якія назіраюцца метстанцыяй, аднолькава важны, таму мы разгледзім тут толькі тыя, якія з'яўляюцца асабліва важнымі, гэта: тэмпература і вільготнасць паветра, ападкі, тэмпература павярховага пласта глебы, снегавы насціл, сонечнае ззянне і некаторыя іншыя.

Разгледзім паасобку, якім спосабам, пры дапамозе якіх прылад вядуцца назіранні над кожным элементам і якое яны маюць значэнне для с/гаспадаркі.

Тэмпература паветра вызначаецца пры дапамозе ртутнага тэрмометра Цэльсія, які ўстанаўліваецца ў спецыяльнай так званай псіхраметрычнай будцы, дзе ён захован ад непасрэднага награвання сонцам.

Праз жалюзійныя сценкі будкі паветра можа свабодна праходзіць у будку і тэрмометр паказвае сапраўдную тэмпературу

вольнага паветра. Апроч звычайнага тэрмометра, які паказвае тэмпературу ў тэрмін назірання, у будцы звычайна змяшчаюцца яшчэ так званыя максімальныя і мінімальныя тэрмометры, якія паказваюць максімальную і мінімальную тэмпэратуру за вызначаны перыяд часу пры дапамозе спецыяльных прыстасаванняў.

Адносна значэння тэмпературы для сельскай гаспадаркі шмат гаварыць не прыходзіцца, яно відавочна. Кожная расліна ў розныя стадыі свайго развіцця мае вызначаную тэмпературу, якая з'яўляецца найбольш спрыяючай для гэтага развіцця,—аптымальную, потым максімальную—вышэй якой расліна не можа развівацца, і мінімальную, ніжэй якой таксама немагчыма развіццё. Дакладны ўлік часу наступлення розных сутачных тэмператур дасць магчымасць прыстасаваць да гэтых тэрмінаў адпаведныя фазы развіцця с/гаспадарчых раслін і такім чынам скласці для іх найлепшыя ўмовы.

Вільготнасць паветра вызначаецца пры дапамозе двух тэрмометраў: „сухога“ звычайнага і „змочанага“, шарык якога непарыўна абвільгочваецца. Дзякуючы таму, што з паверхні шарыка змочанага т-ра ўвесь час будзе выпарацца вада, яго тэмпература будзе ніжэй тэмпературы сухога тэрмометра. Розніца іх паказанняў будзе прапарцыянальна хуткасці выпарэння, апошняя-ж залежыць ад ступені вільготнасці паветра. Вільготнасць паветра вызначаецца як абсалютная і адносная. Для сельскай гаспадаркі асабліва значэнне мае адносная вільготнасць, гэта мера насычанасці паветра вадзяной парай у процантах поўнай яе насычанасці.

Адносная вільготнасць з'яўляецца мерай сухасці паветра, апошняя-ж у значнай ступені вызначае ўмовы развіцця розных культур. У адпаведныя перыяды развіцця гэтых культур найбольш спрыяючай з'яўляецца розная вільготнасць, так, напрыклад, у перыяд кушчэння спрыяе больш нізкая вільготнасць, чым у далейшыя перыяды развіцця. Прызнак вільготнасці паветра з'яўляецца адным з фактараў с/гаспадарчага раёнавання.

Ападкі вызначаюцца з двух бакоў, колькаснага і якаснага. Колькасць ападкаў вымяраецца пры дапамозе дажджамера—вядра, якое пастаўлена на адчыненым месцы. Адзін раз у суткі вымяраюць у міліметрах вышыню вадкасці, якая папала ў вядро. З якаснага боку, г. зн. выгляд ападкаў: дождж, снег, раса і т. п. вызначаецца назіральнікам непасрэдна.

Уплыў ападкаў на с/гаспадарку надзвычайна вялікі. Без адпаведнай колькасці ападкаў немагчыма атрымаць добрага ўраджаю. З другога боку, калі ападкаў выпадае вельмі многа, то гэта можа прывесці к частковай або поўнай пагібелі ўраджаю. Вельмі важна для с/гаспадаркі не толькі агульная сума ападкаў, але і своечасовае выпадзенне гэтых ападкаў у адпаведныя так званыя крытычныя перыяды развіцця с/гаспадарчых культур. Апроч таго вялікае значэнне для с/гаспадаркі мае інтэнсіўнасць ападкаў, там, дзе слабы працяглы дождж можа прынесці вялікую карысць, кароткі, але моцны лівень можа значна пашкодзіць. Такім чынам залежнасць ураджаю ад ападкаў відавочна. Ёсць распрацаваныя спецыяльныя спосабы, якія дазваляюць па колькасці васенніх і веснавых ападкаў прыблізна вызначыць ураджай для некаторых культур. Тэмпература павярховага пласта глебы

вызначаецца спецыяльнымі тэрмометрамі, шарыкі, якія змешчаны ў глебе на адпаведнай глыбіні: 5, 10, 15 і 20 см. Шкала тэрмометра знаходзіцца над паверхняй зямлі, што дазваляе зрабіць адлік, не выймаючы тэрмометра і такім чынам не парушаючы прыродных умоў.

Для с/гаспадаркі вызначэнне тэмпературы павярхovага пласта глебы мае вялікае значэнне ў сэнсе вызначэння тэрмінаў сяўбы для розных культур увесну, што асабліва важна пры звышранняй і ранняй сяўбе.

Працягласць сонечнага ззяння рэгіструецца спецыяльнай прыладай — геліёграфам. Геліёграф пабудован на прынцыпе прапальвання спецыяльнай папяровай стужкі сонечнымі праменнямі праз шкляную кулю, або па хімічным уздзейнічанні сонечных праменняў.

Уплыў сонечнага ззяння на с/гаспадарчыя культуры сказваецца як павелічэннем колькасці прадуктаў, так і якасці іх. Напрыклад, у цукровых буракоў на сонцы значна павялічваецца вага і процантная колькасць цукру. Гэтаксама рэагуе на працягласць сонечнага асвятлення і бульба і іншыя культуры.

Снегавы насціл вымяраецца на станцыі пры дапамозе дрыўлянай рэйкі, якая падзелена на сантыметры. Рэйка ўстанаўліваецца звычайна на абароненым ад ветра месцы, дзе снег ляжыць такім пластом, як і выпаў, а не выдуваецца і не прыносіцца з бакоў. Апроч вышыні снегавога насціла вельмі важна ведаць яго шчыльнасць, каб мець магчымасць вылічыць запас вады, які маецца ў выглядзе снегавога пласта. Прылада для вымярэння шчыльнасці снега—платпамер пабудаваны на тым прынцыпе, што вызначаны аб'ём снега ўзважваецца або растайваецца і вымяраецца колькасць атрыманай пры гэтым вады.

Для сельскай гаспадаркі снегавы насціл мае значэнне, папершае, як ахова азімых пасеваў ад марозаў, прычым ён з'яўляецца асабліва добрай аховай, калі пры значнай вышыні застаецца рыхлым. Падругое, снегавы насціл мае значэнне як запас вады к вясне. Каб больш дакладна ўлічыць гэты запас, назіранні над снегавым насцілам вядуцца не толькі на сталых метэаралагічных станцыях, а на цэлым шэрагу іншых пунктаў у некаторых калгасах і соўгасах, прычым вымярэнні робяцца не на адным месцы, а такім чынам, каб ахапіць усе ўгоддзі,—і сенажаць, і пахаць, і лес, каб скласці поўнае ўражанне адносна размеркавання снегавога насцілу. Дакладны ўлік запасу вільгаці ў выглядзе снегу дае магчымасць зрабіць некаторыя меркаванні адносна будучага ўраджаю.

Апроч гэтых, так сказаць, асноўных назіранняў, шэраг метэаралагічных станцый вядзе яшчэ дадатковыя назіранні, прыстасаваныя спецыяльна для абслугоўвання патрэб с/гаспадаркі. Гэта назіранне над вільготнасцю глебы, над выпарэннем з паверхні глебы і расліннага насцілу. Потым назіранні над тэмпературай паветра на рознай вышыні над паверхняй зямлі—каля расліннага насціла і на адлегласці ад яго і некаторыя іншыя назіранні.

Як бачым з усяго сказанага, метэаралогія, а значыць і метэаралагічная станцыя маюць надзвычайна вялікае значэнне для сельскай гаспадаркі, на гэта ўказвае той факт, што першыя

метэаралагічныя станцыі арганізоўваліся пры вопытных с/гаспадарчых участках і назіранні іх у першую чаргу скарыстоўваліся спецыялістамі—аграномамі, для вырашэння шэрагу праблем с/гаспадаркі. Асабліва важнае значэнне набываюць метфактары для буйнай калектыўнай гаспадаркі і соўгасаў Метэаралагічныя фактары, якія могуць адмоўна ўплываць на с/г, калі іх своечасова не ўлічыць і не падрыхтавацца, раней прыносілі шкоду дробнай аднаасобнай гаспадарцы, а зараз цэламу калектыву. Вось чаму і трэба своечасова ўлічваць кіраўнікам калгасаў і соўгасаў, МТС і раёнам і ўсёй грамадскасці тыя станоўчыя і адмоўныя метэаралагічныя фактары, якія могуць пры адных і тых-жа абставінах мець станоўчы і адмоўны ўплыў на ўраджай і максімальнае атрыманне прадукцыі ў с/г. Апроч таго, калі перш дробныя, аднаасобныя гаспадаркі не мелі магчымасці праводзіць шэраг мерапрыемстваў, якія дыктаваліся метэаралагічнымі паказчыкамі, напрыклад, сеяць адпаведныя гатункі насення, у адпаведныя тэрміны праводзіць с/гаспадарчыя працы і шэраг агра- і культуртэхнічных мерапрыемстваў, дык у сучасны момант у гэтым сэнсе адчынены вялікія магчымасці.

Мы, карыстаючыся данымі назіранняў нашых метэаралагічных станцый, робім спробы акліматызацыі культур, якія раней лічылася немагчымым разводзіць ва ўмовах БССР. Замяняючы, такім чынам, культуры малакаштоўныя культурамі больш каштоўнымі, атрымаем вялікі прыбытак на карысць нашай гаспадаркі.

Цяпер застановімся яшчэ на аднэй вельмі важнай галіне абслугоўвання с/гаспадаркі метэаралагічнай станцыяй, гэта на праракванні надвор'я. Разгледзім механізм дачы прагнозаў. Шэраг метэаралагічных станцый вядзе назіранні ў адпаведныя тэрміны і зараз-жа перадае неабходныя даныя ў выглядзе шыфраваных тэлеграм у цэнтральную ўстанову—Бюро Надвор'я. Там гэтыя даныя наносяцца на так званую сінаптычную карту. Спецыяліст вывучае гэту карту і карты за папярэднія дні і робіць шэраг меркаванняў адносна будучага надвор'я. Работа гэта надзвычайна складаная і адказная, але і вынікі яе надзвычайна каштоўныя. Плануючыя органы с/гаспадаркі, маючы прагноз надвор'я вясны, могуць у адпаведнасці з ім выпрацаваць тэрміны сяўбы розных культур, каб найбольш рацыянальна скарыстаць с/гаспадарчыя машыны, рабочую сілу, і ў выніку атрымаць максімальны ўраджай. Прагноз надвор'я лета і восені дае магчымасць правільна правесці ўборачную кампанію і шэраг іншых мерапрыемстваў.

Кароткатэрміновы прагноз, які даецца на адны суткі ўперад у тым выпадку, калі ён атрыман своечасова, можа прынесці вялікую карысць калгасам і соўгасам у тым сэнсе, што можа быць правільна назначана адпаведная работа на наступны дзень і размеркавана рабочая сіла. Як ужо сказана, прагноз мае каштоўнасць, калі ён атрыман своечасова, і вось тут павінна адыграць сваю ролю радыёфікацыя. У гэтым сэнсе метэаралагічная станцыя з'яўляецца пасярэднікам паміж Бюро Надвор'я і яго спажыўцамі, паасобнымі калгасамі і соўгасамі, яна мае радыёпрыёмнік і яе роля ў тым, каб своечасова паведаміць акаляючыя с/гаспадарчыя ячэйкі аб чакаемым надвор'і, асабліва калі гэта

надвор'е можа з'явіцца шкодным, калі чакаюцца значныя ападкі лівень, шторм, прымаразак.

Адносна прымаразкаў трэба сказаць, што роля метстанцыі не абмяжоўваецца тым, што яна перадае гатовае папярэджанне наконт магчымасці прымаразка. Вясной і восенню, тады, калі прымаразкі могуць з'явіцца асабліва шкоднымі, метэаралагічная станцыя робіць адпаведны аналіз назіранняў над тэмпературай і вільготнасцю паветра, воблачнасцю і некаторых іншых. Грунтуючыся на гэтым аналізе і ўлічваючы мясцовыя асаблівасці — рэльеф, раслiннасць і інш., метстанцыя робіць заключэнне аб ступені магчымасці прымаразка, і калі вынікі пагражаючыя, то дае папярэджанне акаляючым гаспадаркам для прыняцця адпаведных мераў.

Асобна трэба застанавіцца на той ролі, якую адыгрывае метстанцыя ў т. зв. службе ўраджая. Метстанцыя сістэматычна вядзе назіранні над развіццём с-гаспадарчых культур, над ходам с-г. прац, над ажыўленнем азімых пасеваў і цэлы шэраг іншых назіранняў. Усе даныя дасылаюцца ў цэнтральную ўстанову, дзе гэтыя падрабязныя звесткі з месц даюць магчымасць ацаніць агульныя віды на ўраджай. Кожнаму ясна, наколькі важна гэта работа ў планавай гаспадарцы і наколькі яна залежыць ад чоткасці і добраякаснасці працы нізавых ячэек—метстанцый.

Побач з усімі відамі назіранняў работнікі метэаралагічнай станцыі павінны весці і грамадскую працу сярод калгаснікаў, рабочых соўгасаў і МТС, самі непасрэдна абслугоўваюць акаляючыя калгасы і соўгасы. Працаваць пад кіраўніцтвам раённых партыйных і савецкіх арганізацый, быць прамым дапаможнікам Райза, міжраённым камісіям па ўраджайнасці і палітаддзелам і дабіцца таго, каб адмоўныя кліматычныя фактары не прыносілі шкоды соц. с/гаспадарцы.

Н. Малішэўская.

Таварышы загадчыкі і назіральнікі гідраметэаралагічных станцый і пастоў.

Дэкадны бюлетень, які выдаецца Галоўным Кіраўніцтвам Адзінай Гідраметэаралагічнай Службы БССР, зусім не адбівае жыцця перыферыі, якая складае асноўную частку нашае сістэмы. Змест бюлетэня выключна ведамственны, таму што ў ім змяшчаецца матэрыял, здавальняючы запатрабаванні толькі асобных арганізацый, часткова дзейнасць нашага цэнтральнага апарату і нічога не пішацца аб перыферыі. Гэты велізарны недахоп тлумачыцца тым, што работнікі гідрамет. стан. і пастоў не прымаюць удзелу ў дэкадным бюлетэні, не дасылаюць у яго рэдакцыю сваіх матэрыялаў.

У далейшым рэдакцыя зварочваецца з просьбаю да ўсіх загадчыкаў і назіральнікаў прыняць самы шырокі ўдзел у нашым дэкадным бюлетэні. Патрэбна пісаць аб разгортванні соцспаборніцтва і ўдарніцтва, аб усіх недахопах і дасягненнях станцыі ці паста, аб недахопах у працы цэнтральн. апарату, аб рацыяналізацыі назіранняў, аб працы асобных работнікаў і наогул па ўсім пытанням з жыцця станцыі.

Рэдакцыя.

ХРОНІКА

У хуткім часе выходзіць з друку другое выданне брашуры „Прымаразкі і барацьба з імі“ М. Кучынскага.

Усім вядома, што прымаразкі, як позьнія веснавыя, так і раннія асеннія, з'яўляюцца вельмі шкодным з'явішчам для сельскай гаспадаркі, асабліва для яе галін—гародніцтва, садоўніцтва і паляводства, прыводзячы зачастую ўраджаі да значных страт.

Друкуемая кніжка разлічана на шырокі круг калгасных і соўгасных чытачоў, мэтай якой з'яўляецца узброіць іх ведамі аб прымаразках для барацьбы за высокі ўраджай і за добрую яго якасць.

У гэтай кніжцы гаворыцца аб тым, ад чаго бываюць прымаразкі, у якіх мясцах яны могуць стварыцца ў першую чаргу, як прадугледжваць наступленне прымаразкаў і як змагацца з імі, прычым у кніжцы гаворыцца аб прымаразках пераважна ва ўмовах нашай рэспублікі.

Кніжка будзе мець каля 35 старонак, цана 25 кап.

Рэд.

Адказны рэдактар П. Мамаеў.

Члены рэдкалегіі:
А. Кайгарадаў
Ф. Рабаконь
І. Калько
І. Рачыцкі.

Друкарня БелАН. Зак. № 113. Гарліт № 2645 Тыраж 1000 экз. 12 стар.